# Ад "Маленькай гамяльчанкі" да "Міс Беларусь"

## Шчырая размова з першай красуняй краіны




**Нядаўна ўсе даведаліся імя галоўнай прыгажуні Беларусі, якой стала 23-гадовая ўраджэнка Гомеля Элеанора Качалоўская. У творчым спаборніцтве ўдзельнічалі 24 красуні, што некалькі тыдняў рыхтаваліся да самага эфектнага шоу года. Як праходзілі рэпетыцыі, што ўразіла ў фінале і якую адказнасць ускладае тытул "Міс Беларусь", распавяла газеце "Культура" пераможца конкурсу.**

**— Элеанора, віншуем з яркім трыумфам! Ці марылі вы аб ім, калі былі дзіцём?**

— Вялікі дзякуй! У раннія гады я займалася спартыўнай гімнастыкай, але бліскучай будучыні мне не прарочылі, таму што адразу вызначылі: вырасту высокай. Як звычайнае дзіця, мяне захапляла ўсё. Шмат часу праводзіла на лецішчы ў атачэнні прыгожай прыроды, а мяне цікавілі каменьчыкі і звяркі. У шэсць гадоў упершыню зайшла размова аб мадэлінгу. У той час толькі пачалі зараджацца спецыяльныя школы, і я трапіла ў адну з іх. Найбольш запомніўся ўдзел у конкурсе прыгажосці "Маленькая гамяльчанка", у якім я ўпершыню перамагла. Мне спадабалася ўвага навакольных, выступленні на сцэне.

Памятаю, як зімой мы пайшлі з мамай на рынак, і я ўбачыла жанчыну ў вялікіх пальчатках, якая прадавала рыбу. У той момант я палічыла, што гэта і ёсць прафесія мары.

**— А чаму вырашылі атрымаць вышэйшую адукацыю ў сферы культуры?**

— У школьныя гады я была галоўным масавіком-забаўнікам, які мог і праспяваць, і станцаваць, і за дыджэйскім пультам пасядзець. Таму паступіла на факультэт культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці, спецыфіка якога мне была блізкай. Падрыхтоўка ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў аказалася цікавай, моментамі складанай, але менавіта там я навучылася выяўляць сябе ў розных аспектах. Пазней усвядоміла, што ў 16 гадоў выбраць прафесію на ўсё жыццё цяжка, таму пайшла на псіхалогію ў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка па другую вышэйшую адукацыю.

**— Цяпер вы працуеце ў Нацыянальнай школе прыгажосці. Як туды трапілі?**

— Зарабляць пачала яшчэ ў 18 гадоў. Першым і самым безразважным працоўным месцам была дыспетчарская служба 115, куды паведамляюць аб любой камунальнай праблеме. Там я пераадолела агонь, ваду, медныя трубы і выразна ўсвядоміла: не трэба ўсё прымаць на свой рахунак. А ў Нацыянальную школу трапіла пяць гадоў таму самым банальным спосабам — адгукнулася на вакансію ў інтэрнэце. Тут жа працавала пасля размеркавання. Цяпер я кіраўнік невялікага мадэльнага падраздзялення. У мяне процьма абавязкаў — ад падрыхтоўкі касцюмаў да работы з дакументамі.

**— А як з'явілася жаданне паўдзельнічаць у конкурсе "Міс Беларусь — 2023"?**

— Думак, што я пайду на пробы, не было. Кастынг ладзілі ў Нацыянальнай школе прыгажосці, і я нават дапамагала запаўняць анкеты ўдзельніц у прыёмнай камісіі. Калі выходзіла са спартзалы, мяне спыніла кіраўнік дырэкцыі спецпраектаў АНТ Алена Анатольеўна Лобач. Яна сказала: "Дзяўчынка, ідзі паспрабуй". І тут прачнуўся дух авантурызму. Але, стоячы перад камісіяй, упершыню за доўгі час сутыкнулася са страхам і з тым забытым адчуваннем, як перад іспытам: ты павінен нешта расказаць, але не ведаеш нумар білета. Дагэтуль даўно не пакідала зону камфорту.

**— Які этап падчас рэпетыцый аказаўся самым складаным?**

— У працэсе падрыхтоўкі ў нас не было выхадных. Час успрымаўся як адзін доўгі панядзелак, што ніколі не скончыцца. Але калі браць кожны этап паасобку, то арганізатары ўсё спланавалі камфортна і разумна, бо мы паспявалі ўсюды і заўсёды. Наогул, гэта была каласальная фізічная і маральная нагрузка.

**— Разам з іншымі канкурсанткамі вы завіталі на мноства культурных і сацыяльна значных мерапрыемстваў. Якое ўразіла больш за ўсё?**

— Я не ўпершыню наведвала Дом-інтэрнат для пенсіянераў і інвалідаў, але цяперашняя паездка запала ў душу: гісторыя не пра драму, а больш пра абмен вопытам. Выдатна разумела, што максімальна камфортныя ўмовы створаны для гэтых людзей. Але ім банальна не хапае камунікацыі з моладдзю, якая б прынесла новыя ідэі, а яны падзяліліся б сваім досведам. Пажылыя людзі маюць велізарны жыццёвы багаж.

**— Успомнім дзень фіналу. Што вы адчулі, калі выйшлі на сцэну сталічнага Палаца спорту?**

— Здавалася, што гэты кругаварот падзей не скончыцца. Але калі пачаў набліжацца вечар, страх стаў ахопліваць усё больш. Гледачам працэс падаецца лёгкім і маляўнічым: дзяўчатам трэба ўсяго прыгожа прайсціся па подыуме. Але я баялася ўпасці, бо ў нейкі момант пачала лавіць зорачкі ад галавакружэння, арганізм знаходзіўся ў жахлівым стрэсе. Самым страшным момантам для мяне быў нават не інтэлектуальны конкурс, а калі мы выйшлі на ўзнагароджанне. Час спыніўся...

**— Як вы адрэагавалі на папулярнасць у сацсетках, што цяпер узляцела?**

— Заўсёды актыўна вяла профіль у Instagram і працягваю гэта рабіць. У цэлым я прыхільнік адкрытасці, з задавальненнем паказваю жыццё.

У ноч пасля перамогі я злавіла вялізную хвалю папулярнасці і хейту. Мне прыемна чытаць пазітыўныя каментарыі, але таксама часам сустракаюцца і негатыўныя. Стараюся на гэтым не факусіравацца, бо колькі людзей, столькі і меркаванняў. Усім не спадабаешся.

**— Якія абавязкі кладуцца на плечы міс Беларусь?**

— Максімальна актыўнае сацыяльнае жыццё. З асабістага: яшчэ два гады пасля перамогі нельга выходзіць замуж.

**— Хутка вы прадставіце нашу краіну на міжнароднай арэне. Ці пачалася падрыхтоўка да "Міс Свету"? І чым зоймецеся ў найбліжэйшы час?**

— Вельмі хачу годна прадставіць Беларусь на сусветнай пляцоўцы. Дакладныя даты "Міс Свету" невядомыя, але мы пачынаем рыхтавацца. На шчасце, усе дзяўчаты, якія ўдзельнічалі ў конкурсах такога маштабу, заўжды на сувязі. Марыя Васілевіч і Анастасія Лаўрынчук спрабавалі сілы ў гэтым спаборніцтве. У нас ужо запланавана сустрэча, на якой мы абмяркуем спецыфіку мерапрыемства.

Калі казаць пра асабістыя планы, то хачу атрымаць правы кіроўцы і пракаціцца на новым аўто па беларускіх дарогах. І мару з'ездзіць на адпачынак у Налібоцкую пушчу. Вядома, нягледзячы на новы статус, хачу не страціць сябе — застацца такой жа простай і адкрытай дзяўчынай!

**Настасся ЮРКЕВІЧ**




Элеанора Качалоўская са школьнікамі Воранаўскага раёна

▸ Пасля перамогі ў конкурсе "Міс Беларусь — 2023" Элеанора Качалоўская працягвае актыўна праяўляць грамадзянскую пазіцыю. Не так даўно дзяўчына правяла майстар-клас па дэфіле для школьнікаў Воранаўскага раёна, наведала прэм'еру фільма "На другім беразе". Не забылася надаць увагу і спорту — паўдзельнічала ў забегу на Мінскім паўмарафоне — 2023 і ў велапрабегу "Адзінствам моцная Беларусь".